*І. А. ЕЎТУХОЎ, к. г. н., дацэнт БДУ*

# МАНІХЕЙСКАЯ КАНЦЭПЦЫЯ ЧАЛАВЕКА

Заснавальнік маніхейства прарок Мані (ці Маніхей) нарадзіўся каля 216 г. у Іране. Магчыма першы штуршок для пачатку яго пропаведзі далі нейкія галюцынацыі, якія мелі месца ў яго ў дзяцінстве і юнацтве. У канцы 30-х гг. III ст. Мані шмат падарожнічае па Ірану, Сярэдняй Азіі, Індыі. У гэтых краінах з вельмі багатай рэлігійнай традыцыяй ён набіраецца ўражанняў і ведаў. У выніку ідзе паступовае фарміраванне яго ўласнай рэлігійнай канцэпцыі, у аснову якой быў пакладзены своеасаблівы сінтэз шматлікіх усходніх сістэм і хрысціянства. У пачатку 40-х гг. Мані выступае з першымі пропаведзямі. Пры гэтым ён заяўляў наступнае: «Мудрасць і (добрыя) справы нязменна прыносіліся людзям пасланнікамі бога. У першы раз яны былі прынесены ў Індыю праз пасланніка,

якога звалі Будай, у другі — у Іран праз пасрэдніцтва Зарадушта, у наступны раз — у краіны Захаду праз пасрэдніцтва Ісуса. У сучасную апошнюю эпоху напісана гэтае вось адкравенне ў краіну Вавілонскую, і выявілася прароцтва ў асобе маёй, Мані, пасланца бога Ісціны»[1].

Мані было дазволена правесці рэлігіныя рэформы. Дзеля гэтага ён пры дапамозе сірыйскай азбукі запісаў свае тэксты на сярэднеперсідскай мове. Пры гэтым было падкрэслена, што прапанаванае вучэнне ў адрозненне ад зараастрызму запісана самім аўтарам і таму яно з'яўляецца адзіным, дасканалым і пазбаўленым супярэчнасцяў [2].

Аднак, ужо ў 275 г. Мані арыштавалі, а ў 277 г. пры Баграме І пакаралі смерцю за выступленні супраць дзяржаўнай рэлігіі. Пасля смерці Мані створаная ім рэлігія пачала жыць уласным жыццём — яна вельмі хутка распаўсюджвалася і ў рэшце рэшт ахапіла тэрыторыі ад Іспаніі на Захадзе да Кітая на Усходзе.

На тэрыторыю рымскай Паўночнай Афрыкі маніхейства пачало пранікаць у канцы IV ст. Рэакцыя на новае веравызнанне з боку імперскай улады была адназначна адмоўная. Ужо ў 297 г. у адказ на інфармацыю праконсула Афрыкі Юліяна пра рэлігійную сітуацыю ў рэгіёне Дыяклетыян загадаў знішчаць маніхейскія творы. Праблемы ў адносінах з цэнтральный уладай былі ў прыхільнікаў персідскага прарока і ў наступных стагоддзях. У 372 г. у Рыме па загаду Валентыніяна І былі знішчаны маніхейскія кнігі і месцы набажэнстваў, па эдыкту Феадосія Вялікага 381 г. маніхеі пазбаўляліся грамадзянскіх правоў, у 405 г. імператар Ганорый выгнаў прыхільнікаў гэтага культу з дзяржаўных пасад, Валентыніян III выселіў маніхеяў з Рыма (425 г.), а імператар Феадосій II наогул забараніў ім пражываць у гарадах (428 г.) [3].

Цалкам зразумела, што паміж маніхеямі Пярэдняй Азіі, Кітая і Заходняй Еўропы не было адзінства. У дакладзе будзе аналізавацца толькі той варыянт маніхейства, які быў зафіксаваны ў трактаце «Супраць ерасяў» Епіфанія Кіпрскага [4] і палемічных творах Аўрэлія Аўгусціна, які ў маладосці сам быў маніхеем, а пасля пераходу ў хрысціянства змагаўся супраць сваіх былых адзінаверцаў [5].

Асаблівасцю маніхейскай канцэпцыі чалавека выступае яе вельмі моцная сувязь з агульнай карцінай свету. Пры гэтым антрапалагічная сістэма можа быць зразумела толькі пасля аналізу касмалогіі.

Дастаткова традыцыйнай крыніцай для агульнага выкладу маніхейскага светаўспрымання выступае прамова Цірвона, вучня Мані, якую прыводзіць Епіфаній Кіпрскі ў сваім творы «Супраць ерасяў».

Ад самага пачатку было два роўных бога, супрацьлеглых адзін аднаму, якія вызначаюцца як Дабро і Зло, Святло і Цемра. Яны пастаянна змагаюцца адзін з адным, але кожны з іх цалкам кантралюе пэўную частку тэрыторыі космаса.

Падчас аднаго з канфліктаў цар Цемры занадта далёка паглыбіўся на тэрыторыю свайго адвечнага ворага. Тады бог Святла выпусціў з сябе нейкую сілу, якую назваў Маці Жыцця. Апошняя, у сваю чаргу, дала жыццё Першачалавеку і пяці стыхіям (вецер, святло, вада, агонь, матэрыя).

Першачалавек узяў стіхіі як зброю і пайшоў уніз, ваяваць супраць Цемры. Але вайна была для яго непасяховай і ён звярнуўся па дапамогу да бога Святла. Бог Святла выпусціў яшчэ адну сілу — Жывога Духа. Апошні працягнуў Першачалавеку правую руку і дапамог яму выбрацца з царства Цемры.

Але пэўная частка душы Першачалавека была ўтрымана ў царстве Цемры. Дзеля яе выратавання Жывы Дух стварыў свет бачны, а таксама два свяцілы (Сонца і Месяц). Пасля гэтага была створана зямля, якую трымае на плячах асілак Амафор. Адначасова пэўныя захады рабіліся і з боку бога Цемры, які імкнуўся ўтрымаць у межах свайго царства частку душы, якая была ўзята ў палон. Дзеля гэта быў створаны яшчэ адзін Першачалавек (матэрыя), у целе якога была захавана душа.

Дзеля таго каб выратаваць душу з палону цемры Жывы Дух паслаў на зямлю свайго сына ў выглядзе чалавека. Той змайстраваў кола з дванаццаццю пасудзінамі. Кола вярцелася, пасудзіны зачэрпвалі душы і паднімалі іх уверх. Там яны ачышчаліся праменямі Сонца, пасля чаго перадаваліся Месяцу. У выніку ён паступова запаўняўся (фазы Месяца). Пасля запаўнення душы перавозіліся ў краіну «усходняга ветра» (з'яўленне маладзіка), дзе яны далучаліся да сваёй радзімы — слупа святла [6].

Пэўныя ўдакладненні да прапанаванай агульнай карціны дазваляе зрабіць матэрыял «Падмуркавага ліста» (Epistula Fundamenti), які прыводзіцца Аўрэліям Аўгусцінам у накіраваным супраць яго палемічным творы.

Царства Святла знаходзіцца на поўначы, цемры — на поўдні. Дзеля больш вобразнага ўяўлення агульнай карціны Аўрэлій Аўгусцін

выкарыстаў прыклад хлеба, які па рымскаму звычаю дзяліўся на чатыры клінападобныя часткі. Да першага царства пры гэтым належалі тры белыя кліны, бясконцыя і па гарызынталі, і па вертыкалі, да другога — чорны клін, бясконцы ўглыб і ў даўжыню. Над зямлёй Цемры знаходзілася бясконцая пустэча [7].

На гэтым касмалагіяным падмурку ствараецца пэўная канцэпцыя чалавека. У агульных рысах яна выкладзена ў 46-м раздзеле трактата Аўрэлія Аўгусціна «Пра ерасі».

На думку аўтара чалавек з'яўляецца вынікам перапляцення двух пачаткаў, добрага і злога (duas mentes, unam bonam, altera malam), якія знаходзяцца ў стане перманентнай барацьбы, якая будзе цягнуцца да іх канчатковага раздзялення.

Жыццё чалавека павінна разгортвацца па двух асноўных накірунках. Па-першае, нельга было замацоўваць існуючае становішча, па-другое, трэба было працаваць дзеля вызвалення асобных частак святла.

З першым накірункам звязаны так званыя «дзве пячаткі» маніхеяў. Пячатка лона (signaculum sinus) — забарона паміж супругамі тых шлюбных зносін, якія могуць мець вынікам цяжарнасць, каб не звязваць з матэрыяй часткі боскай субстанцыі. Пячатка вуснаў (signaculum oris) — забарона есці нячыстыя прадукты харчавання: мяса, кроў, віно. Акрамя таго маніхеям забаранялася праца на зямлі. У апошнім выпадку нельга нават зрываць нават адзіны ліст якой-небудзь расліны.

Рэалізацыі другога накірунку была падпарадкавана іерархічная структура маніхейскай эклесіі. Зыходзячы з дадзеных Аўрэлія Аўгусціна, на чале ўсёй арганізацыі стаіць правадыр (princeps) і дванаццаць настаўнікаў (magistri), ніжэй якіх знаходзяцца семдзесят два біскупы, якія прызначаюць старшых і дыяканаў. Уся гэтая група кіраўнікоў вызначаецца як выбраныя (electi). Ніжэй іх знаходзяцца звычайныя маніхеі — слухачы (auditori).

Слухачы прыносілі выбраным маніхейскай абшчыны ежу. Пасля яе прыёму і адпаведных малітваў святыя не толькі вызвалялі адтуль часткі святла, якія патрапілі ў палон да матэрыі, але і накіроўвалі да бога светлыя часткі душы слухачоў, што спрыяла іх вызваленню [8]. Фактычна быў створаны механізм па збору частак святла, які дапамагаў машыне, якую пабудаваў Хрыстос.

Азначаныя моманты — ганенні з боку цэнтральнай улады, арыентацыя простых вернікаў на аскетычны лад жыцця, адназначна адмоўнае

моўнае стаўленне да земляробства, дастаткова арыгінальны шлях да вызвалення (праз зубы і вантробы святых (Conf. III, 10, 18), прычым, як падкрэслівае М.Е.Сергеенка, апошні выраз далёка не ў поўным аб'ёме перадае здзек аўгусцінаўскага словазлучэння dente et ventre [9]), як можна меркаваць не спрыялі стварэнню станоўчага вобразу маніхейства на заходнерымскіх землях. У выніку яны пачалі выкарыстоўваць тактыку маскіроўкі пад больш папулярную канфесію, у дадзеным выпадку хрысціянства.

Неабходны пераклад маніхейскай канцэпцыі на мову хрысціянскіх сімвалаў дае Фаўст Мілеўскі, які звязвае бога-айца са святлом, бога-сына — з Сонцам, дзе знаходзіцца яго моц, і Месяцам, дзе знаходзіцца яго прамудрасць, бога-святога духа — з паветрам. Гарантам паратунку выступае Хрыстос-пакутнік (partibelem Iesum), які вісіць на кожным дрэве[10].

---

[1] Бируни. Оставшиеся памятники минувших поколений / Пер. А.Э.Шмидта // Ученые записки института востоковедения АН СССР. Т. 16. М., 1958. С. 487 – 488.

[2] История древнего мира. Упадок древних обществ. М., 1983. С. 190.

[3] Myszor W. Manicheizm w Afryce Północnej i święty Augustyn // Św. Augustyn Pisma przeciw Manichejczykom. Warszawa, 1990. S. 7–10.

[4] Епифаний Кипрский. Творения. М., 1872. Ч. 3.

[5] Św. Augustyn. Pisma przeciw Manichejczykom. Warszawa, 1990.

[6] Епифаний Кипрский. Творения. М., 1872. Ч. 3. С. 279 – 285.

[7] List, który nazywaja «Listem Podstawowyin» // Św. Augustyn Pisma przeciw Manichejczykom. S. 130.

[8] Doctryna manicheizmu w Africe Północnej: Augustyn, De haeresibus 46 // Św. Augustyn Pisma przeciw Manichejczykom. S. 21–25.

[9] Сергеенко М.Е. Примечания // Исповедь Блаженного Августина, епископа Гиппонского. М., 1991. С. 421.

[10] Św. Augustyn Przeciw Faustusowi. Księgi I–XXI. Warszawa. 1991. S. 215, 225.